№9 (201)
Кастрычнік 2006

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## За неправамоцныя дзеяньні трэба адказваць

**У Камітэце ААН па правах чалавека ў Жэнэве разглядаецца заява беларускага грамадзяніна Віктара Карніенкі**

Скарга тычыцца дзеяньняў праваахоўных органаў Жлобінскага раёну (Гомельская вобласьць). Падчас прэзідэнцкіх выбараў Віктар Карніенка, зьяўляючыся даверанай асобай кандыдата ў прэзідэнты А.Мілінкевіча, вёз з Менску 28 тысячаў асобнікаў перадвыбарчай праграмы і агітацыйных улётак. Яны былі надрукаваныя за грошы, якія дзяржава дала кожнаму кандыдату на вядзеньне агітацыі. Аднак па дарозе ўсю друкаваную прадукцыю – а гэта 25 адсоткаў накладу агітацыйных матэрыялаў Мілінкевіча – канфіскавалі супрацоўнікі аддзелу ўнутраных справаў Жлобінскага раёну.

“Справу разглядаў суд Жлобінскага раёну. Судзьдзя Сяргей Шаўцоў пастанавіў: за тое, што ва ўлётках быў сказ “Мілінкевіч – новы прэзідэнт, якім Вы зможаце ганарыцца”, прысудзіць В.Карніенку штраф, а ўсе 14 тысячаў улётак канфіскаваць. Што тычыцца перадвыбарчай праграмы – таксама 14 тысячаў штук – то яе канфіскацыю праваахоўныя органы ніяк не патлумачылі”, – паведаміў belngo.info Леанід Судаленка, старшыня Гомельскага гарадзкога аддзяленьня грамадзкага аб’яднаньня “Прававая ініцыятыва”.

Спачатку В.Карніенка зьвярнуўся ва ўсе беларускія інстанцыі – Гомельскі абласны суд, абласную пракуратуру, Вярхоўны суд і Генеральную пракуратуру. Ён прасіў патлумачыць, на якой падставе міліцыя канфіскавала перадвыбарчую праграму. В.Карніенка ня згодны і з канфіскацыяй агітацыйных улётак, а тым больш з накладаньнем штрафу за іх – бо тэкст улёткі быў афіцыйна ўзгоднены ў Цэнтральнай выбарчай камісіі.

“Тым ня менш, беларускія інстанцыі пакінулі рашэньне Жлобінскага суда без зьмяненьня. А чаму міліцыя канфіскавала перадвыбарчую праграму, мне ўвогуле не патлумачылі. Таму я і зьвярнуўся з заявай у Камітэт ААН па правах чалавека. Я ўпэўнены, што ўсе службовыя асобы, якія зараз робяць неправамоцныя дзеяньні, з цягам часу адкажуць за гэта”, – сказаў В. Карніенка.

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*


Фота Юліі Дарашкевіч. "НН"
*Зьміцер Дашкевіч за кратамі.*

# Неабгрунтавана жорсткі прысуд

***Лідэр “Маладога Фронту” Зьміцер Дашкевіч асуджаны на 1,5 гады калоніі агульнага рэжыму***

1 лістапада ў 16 гадзінаў намесьнік старшыні суда Кастрычніцкага раёну г. Менску Ала Булаш абвясьціла прысуд па справе лідэра “Маладога Фронту” Зьмітра Дашкевіча — паўтары гады пазбаўленьня волі ў калоніі агульнага рэжыму. Ён абвінавачаны ў парушэньні арт.193 — “дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі”. Працэс па справе адбываўся ў закрытым рэжыме, на абвяшчэньне прысуду, якое заняў некалькі хвілінаў, у судовую залу дазволілі прайсьці бацьку Зьмітра, амбасадарам краінаў Еўрасаюзу і ЗША, а таксама некаторым журналістам.

Падтрымаць лідэра “МФ” да будынку суда прыйшло шмат маладых людзей, якія трымалі партрэты Зьмітра Дашкевіча, скандавалі “Свабоду Дашкевічу!”, “Ганьба!”. Усклаўшы на ганак суда бел-чырвона-белыя кветкі, маладыя людзі на знак салідарнасьці сталі на калені, дэманструючы — “Сядзім разам з Дашкевічам!”

Праваабаронца Алесь Бяляцкі пракаментаваў: “Я лічу, што гэта неабгрунтавана жорсткі прысуд, і закрытасьць самога працэсу сьведчыць пра тое, што ўладам, як і ў выпадку з “Партнёрствам”, не было чаго паказваць, не было падставаў, якія цягнулі б на такі тэрмін. Разам з тым радуе тое, што пазіцыя міжнароднай супольнасьці і беларускай моладзі, якая прыйшла падтрымаць лідэра “Маладога Фронту”, супадаюць, гэта вельмі істотна”.

## Прызнаны вязьнем сумленьня

У тэлефоннай размове з прадстаўніком праваабарончага цэнтру “Вясна” супрацоўніца лонданскага офісу Міжнароднай амністыі Хэза Макгіл паведаміла, што яны распачынаюць акцыю падтрымкі Зьмітра Дашкевіча. Сябры Міжнароднай амністыі па ўсім сьвеце будуць дасылаць лісты падтрымкі палітвязьню. Плануюцца таксама і іншыя захады салідарнасьці з Дашкевічам.

Акрамя таго, расказала Хэза Макгіл, Міжнародная амністыя прызнае Зьмітра Дашкевіча вязьнем сумленьня.

# Палітычная расправа

## *Заява Праваабарончага цэнтру “Вясна” ў сувязі з вынясеньнем жорсткага прысуду Зьмітру Дашкевічу*

Праваабарончы цэнтр “Вясна” расцэньвае крымінальны перасьлед і асуджэньне моладзевага лідэра Зьмітра Дашкевіча як палітычную расправу за перакананьні і грамадзка-палітычную дзейнасьць

Мы, сябры Праваабарончага цэнтру “Вясна”, выказваем рашучы пратэст супраць асуджэньня Зьмітра Дашкевіча на 1,5 гадоў пазбаўленьня волі і лічым крымінальны перасьлед моладзевага актывіста незаконным, парушэньнем правоў чалавека.

Зьміцер Дашкевіч быў затрыманы 15 верасьня 2006 году і абвінавачаны паводле арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (арганізацыя дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі ці ўдзел у ёй). Больш за месяц Зьміцер незаконна ўтрымліваўся ў СІЗА у бесчалавечных умовах. Судовы працэс пачаўся 30 кастрычніка ў судзе Кастрычніцкага раёну г. Менску і праходзіў за зачыненымі дзьвярыма ў горшых традыцыях сталінскіх часоў. На судовы разгляд не дапусьцілі журналістаў, прадстаўнікоў грамадзкасьці, родных Зьмітра.

*Праваабарончы цэнтр “Вясна” заяўляе:*

Мы лічым арт. 193.1 КК Рэспублікі Беларусь і практыку яго выкарыстаньня парушэньнем правоў грамадзянаў Беларусі на свабоду асацыяцыяў, свабоду выказваньня меркаваньняў, гарантаваных Канстытуцыяй Беларусі і Міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Мы лічым, што з боку міжнароднай супольнасьці і беларускай грамадзкасьці павінна быць дадзеная адпаведная ацэнка дзеяньням канкрэтных асобаў, якія дапускаюць парушэньні правоў чалавека ў краіне. У прыватнасьці, асобаў, якія непасрэдна займаліся перасьледам Зьміцера Дашкевіча: судзьдзі суда Кастрычніцкага раёну г. Менску Алы Булаш; старшага саветніка юстыцыі пракуратуры Кастрычніцкага раёну г. Менску Бароўскага, які падтрымліваў дзяржаўнае абвінавачаньне падчас судовага працэсу; намесьніка Генеральнага пракурора Беларусі Пруса, які санкцыянаваў арышт Зьмітра Дашкевіча.

Мы заклікаем прадстаўнікоў АБСЕ, Савету па правах чалавека ААН, міжнародных праваабарончых арганізацыяў зьвярнуць увагу на сістэматычныя парушэньні правоў чалавека ў Беларусі.

Мы патрабуем неадкладнага вызваленьня Зьмітра Дашкевіча і іншых палітычных вязьняў Беларусі і спыненьня рэпрэсіяў супраць палітычных апанентаў рэжыму А. Лукашэнкі.

*г. Менск, 02.11.06 г.*

## Выбараў у Беларусі ня будзе

***Прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партыяў не ўвайшлі ў склад тэрытарыяльных выбарчых камісіяў па выбарах у мясцовыя саветы***

Аб гэтым заяўлена 23 кастрычніка на паседжаньні кіраўнікоў выбарчых штабоў палітычных партыяў.

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік выбарчага штабу Аб`яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Анатоль Паўлаў, усяго палітычнымі суб`ектамі, якія працуюць у рамках абвешчанай апазіцыяй кампаніі “Мясцовыя выбары”, былі вылучаныя больш за 100 прадстаўнікоў у склады тэрытарыяльных камісіяў. “Мы расцэньваем гэта як пацьвярджэньне вядомага тэзісу. Выбараў у Беларусі ня будзе”, – заявіў А.Паўлаў.

Ён таксама паведаміў, што падчас паседжаньня кіраўнікоў штабоў былі абмеркаваныя пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй вучобы будучых кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў, а таксама пытаньні аказаньня ім юрыдычнай дапамогі. Аб гатоўнасьці даць магчымасьць кандыдатам ад дэмакратычных партыяў карыстацца паслугамі юрыстаў заявілі, у прыватнасьці, Аб`яднаная грамадзянская партыя і Партыя БНФ.

Трэба адзначыць, што ў цэлым па краіне было сфармавана больш за 1,5 тыс. камісіяў, у кожную з якіх увайшло ад 7 да 11 чалавек (для камісіяў нізавога ўзроўню) і ад 9 да 13 (для камісіяў базавага ўзроўню).




Фота bymedia.net

## Дзяды ў Менску

Штогадовая акцыя, якая адбываецца ў сьвяты для беларусаў дзень ушанаваньня памяці Дзядоў — продкаў, сёлета была адной з самых масавых пасьля сакавіцкіх падзеяў Менскай вясны-2006.

Традыцыйнае шэсьце да Курапатаў — месца масавых захаваньняў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў — сабрала сотні менчукоў і гасьцей сталіцы. Удзельнікі шэсьця і кароткага мітынгу ўсталявалі ў Курапатах крыжы ў памяць загінулых. Галоўнай ідэяй акцыі стаў пратэст супраць гульняў Лукашэнкі ў саюзы з праімперскімі коламі Расіі.

## Сьпіс неўязных службовых асобаў пашыраны

Лік асобаў, якія сталі неўязнымі ў краіны Еўрасаюзу папоўнілі судзьдзя Маскоўскага раённага суда г. Менску Аляксей Рыбакоў, які вынес экс-кандыдату ў прэзідэнты Аляксандру Казуліну прысуд 5,5 гадоў пазбаўленьня волі, а таксама супрацоўнік пракуратуры Маскоўскага раёну Сяргей Бортнік, які выступаў на працэсе па справе Казуліна дзяржаўным абвінаваўцам.

Разам з імі ў “чорны сьпіс” патрапілі судзьдзя Цэнтральнага раённага суда Менску Леанід Ясіновіч, які выносіў прысуды па справе “Партнёрства”, і супрацоўнік пракуратуры Цэнтральнага раёну Андрэй Мігун, які выступаў дзяржаўным абвінаваўцам на гэтым зачыненым працэсе. Нагадаем, што судзьдзя Леанід Ясіновіч прысудзіў Эніру Браніцкую і Аляксандра Шалайку да 6 месяцаў арышту, Цімафея Дранчука – да году, а Мікалая Астрэйку – да двух гадоў пазбаўленьня волі.

Раней у сьпіс неўязных былі ўключаныя 37 беларускіх службоўцаў на чале з Аляксандрам Лукашэнкам. Асноўныя прычыны забароны на ўезд у краіны ЕС – дачыненьне да выкраданьняў і забойстваў лідэраў апазіцыі, падаўленьне мірных дэманстрацыяў, фальсіфікацыя вынікаў выбараў, а таксама вынясеньне “палітычных” судовых прысудаў.

## Зьміцер ДАШКЕВІЧ:

# Гісторыя трох дзён

***На сайце “Маладога фронту” зьмешчаны артыкул арыштаванага лідэра моладзевай арганізацыі Зьмітра Дашкевіча, які ён даслаў з менскага СІЗА па вул. Валадарскага. Мы друкуем яго цалкам:***

Рэспубліка Беларусь. Менск, вуліца Валадарскага, дом 2. Па гэтым адрасе, у цэнтры гораду, каля Чырвонага касьцёлу і Дому Ураду, чатырохзоркавага гатэлю “Менск” і драматычнага тэатру імя Горкага, жыве дзьве з паловаю тысячы чалавек. І ўсё было б добра ў гэтай гісторыі, каб будыначак той, у цэнтры сталіцы еўрапейскае краіны, ня быў бы турмою...

Турма. Нешта загадкава-небясьпечнае хаваецца ў гэтым слове для чалавека, які ніколі ў жыцьці ня быў абмежаваны воляю. А нават калі і бываў наш брат на якім-небудзь Акрэсьціна, ён ня можа сабе ўявіць, што хаваецца за старадаўнімі мурамі Пішчалаўскага палацу.

Не, тут зусім ня страшна. Жывуць зьняволеныя нават гадамі, у гэтых туберкулёзных, насьмерць пракураных камерах, якія паласкаваму на матчынай мове называюцца – “хатамі”, нібы падкрэсьліваючы кожнаму новаму наведвальніку цэнтралу – твой дом цяпер тут, тут цяпер твая хата.

### Злодзейскія законы

У прынцыпе, любая чалавечая супольнасьць схільная да фармаваньня законаў для сваёй жыцьцядзейнасьці. Працэс гэты неабходны і пазітыўны. Ствараюцца законы супольнасьцю як жаданьне ўпарадкаваць ці абмежаваць дзейнасьць сваіх прадстаўнікоў.

Тое ж самае адбылося ў супольнасьці людзей, што пазбаўленыя волі – зэкаў. Фармуючы “свае” законы яны клапаціліся пра жыцьцядзейнасьць “сваёй” сістэмы ў супрацьстаяньні з іншаю сістэмаю – міліцэйскаю (ці “мусарскаю”, як яе называюць ня толькі тут). Сэнс супрацьстаяньня – лібералізаваць апошнюю і зрабіць больш прыдатнаю для жыцьця. Ну, да прыкладу, носьбіты злодзейскай маралі дамагаюцца ад адміністрацыі турмаў і калоніяў павелічэньня колькасьці дазволеных перадачаў, дазволу карыстацца электрычнасьцю, вентылятарамі, тэлевізарамі, фармуюць “абшчакі” для дапамогі тым, хто заехаўшы ў турму нічога ня мае, ну і г.д. Карацей, улічваючы, што “мусарскія” законы — гэта законы бесчалавечныя, дык законы “злодзейскія”, што супрацьстаяць першым, — гэта законы чалавечыя і для людзей.

Ну, з законамі першае сістэмы, мы знаёмыя і неаднаразова спрабавалі іх на сваёй скуры. Таму можам пагадзіцца з арыштанцкаю характарыстыкаю чалавечнасьці іх. А вось што датычыцца злодзейскіх законаў, дык ня кожнаму шчасьціць пазнаёміцца з імі на сваім жыцьцёвым шляху.


Фота Юліі Дарашкевіч, “НН”

### Адаптацыя

Пачалася яна для мяне ў першым СІЗА Беларусі, у пятніцу. А тых, хто трапляе сюды ў апошні працоўны дзень і выходныя, трымаюць да панядзелку ў адстойніках. Адстойнікі, гэта такія сьпецыялізаваныя камеры з драўлянымі насьцілами замест нараў, дзе прыбіральня (“дальняк”, ці “даліна” па-мясцоваму), служыць адначасова ў якасьці ўмывальніку. Гэта цяжкавата зразумець таму, хто не сутыкаўся з такою сістэмаю. А яна вельмі простая – у куце камеры, без ніякіх перагародак знаходзіцца плоскі ўнітаз, а над ім кран з вадою. Вось такая эканамічная канструкцыя, што называецца – два ў адным. Усё ж такі ўмеюць нашыя, калі захочуць.

Ну дык вось, адстойнік нумар адзін, дзевяць, восем (так тут прынята агучваць лічбы), які стаўся мне домам на тры дні, меў плошчу каля 12 м. кв., а запхнуць туды ўмудрыліся 25 чалавек. Нават адзін бывалы, каторы праз гэтыя адстойнікі ўжо 8 месяцаў езьдзіць на суд, казаў, што больш за 18 чалавек тут яшчэ ня бачыў. Але мяжы чалавечае вынослівасьці, у гэткага кшталту ўстановах, проста няма.

І ўжо ў адстойніку, як у любым памяшканьні камернага тыпу, дзе знаходзіцца носьбіты турэмнае ідэі, пачынаюць дзейнічаць злодзейскія законы і адпаведная іерархія, у якой усім хочацца заняць месца як мага лепшае.



Фота Юліі Дарашкевіч, “НН”

### Месца ў сістэме

Кожны яго пачынае намацваць з першых жа дзён, заварожана слухаючы зэкаў, што ўжо некалькі разоў прайшлі па гэтым пекле: турма – этап – лагер. На месцы ж, засвойваючы правілы паводзінаў, кожны ўяўляе сябе маральным аўтарытэтам. Ну, як мы з вамі зразумелі, тут свая мараль.

Чалавек, які мае ўстойлівы характар, даволі хутка абжываецца ў турэмнай сістэме і падпарадкоўваецца яе законам. Чалавек жа слабавольны і бесхарактарны ў гэтай установе хутка пераўтвараецца ў ізгоя, якога будуць разводзіць і абсьмейваць. Ёсьць яшчэ адна катэгорыя арыштантаў. Гэта людзі, якія па сваіх маральных стандартах, ня могуць прыняць законаў “мира воров” і таму ўваходзяць з ім у непазьбежны канфлікт. Такіх індывідуумаў знайсьці тут, ва ўсіх 225 хатах, цяжка, але ж рэальна. Звычайна на гэтых людзей ажыцьцяўляецца фізічна-маральны ціск, і чалавек альбо прымае правілы гульні, альбо

*(Працяг на стар. 7)*

### Вызваліць неадкладна...

**Няўрадавая арганізацыя са сьпецыяльным кансультацыйным статусам у ААН Міжнародная ліга правоў чалавека выказала глыбокую занепакоенасьць у сувязі з вынесеным 1 лістапада прысудам лідэру арганізацыі “Малады фронт” Зьмітру Дашкевічу**

**Паводле зьвестак Радыё Свабода, у лісьце, накіраваным на адрас Аляксандра Лукашэнкі, Ліга правоў чалавека расцэньвае выстаўленыя Дашкевічу абвінавачаньні як палітычна матываваныя. Зьвяртаючыся да кіраўніка Беларусі, Ліга заклікае яго забясьпечыць, каб усе беларускія грамадзяне мелі магчымасьць выказваць свае погляды бяз боязі апынуцца пад судовым перасьледам.**

**Ліга правоў чалавека патрабуе неадкладнага вызваленьня Зьміцера Дашкевіча і іншых беларускіх палітычных зьняволеных.**

# Два гады турмы за неадпраўлены ліст

***Праваабаронца Кацярына Садоўская абвінавачаная ў абразе Аляксандра Лукашэнкі***

У судзе Ленінскага раёну г.Менску 22 кастрычніка распачаўся разгляд крымінальнай справы, узбуджанай супраць праваабаронцы Кацярыны Садоўскай. У суд прыйшлі больш як тры дзясяткі чалавек, якім у свой час яна дапамагала.

Кацярыну Садоўскую абвінавачваюць у зьнявазе судзьдзяў і пагрозах, а таксама ў абразе Аляксандра Лукашэнкі. Падставай дзеля крымінальных справаў супраць Кацярыны Садоўскай сталі лісты, якія атрымала судзьдзя Кіраўскага суда (на Магілёўшчыне) Надзея Чмара і яе калега спадарыня Уліціна.

Судзьдзі зьвязалі абразьлівыя выразы на іх адрас з імем Кацярыны Садоўскай. Праваабаронца не прызнала сваёй віны. Яна паведаміла, што ніколі не пісала такіх лістоў. Адвакат спадарыні Садоўскай зьвярнуў увагу на тое, што сьледства не здабыло доказаў таго, што лісты былі набраныя на кампутары, якім карыстаецца спадарыня Садоўская. Ён прасіў прызначыць эксьпертызу, каб высьветліць аўтарства лістоў. Але яму адмовілі ў гэтым.

Пракуратура настойвае, каб Кацярыну Садоўскую за лісты з пагрозамі на адрас судзьдзяў на год пазбавілі волі. Судзьдзі Чмара і Уліціна заявілі пазоў на кампенсацыю маральных стратаў — два мільёны рублёў кожнай. Абвінаваўца казала, што судзьдзі панесьлі маральныя страты падчас папярэдняга сьледзтва.

Адвакат прасіў, каб ягонай падабароннай зьмянілі меру стрыманьня і адпусьцілі дахаты. Ён спаслаўся на тое, што ў хворай 60-гадовай жанчыны на ўтрыманьні знаходзяцца 84-гадовая маці і муж-інвалід. Суд не задаволіў хадайніцтва, бо Кацярыну Садоўскую абвінавачваюць у больш цяжкім злачынстве — абразе Аляксандра Лукашэнкі.

Прадстаўніца пракуратуры спаслалася на вынікі лінгвістычнай эксьпертызы, згодна з якімі зьмест ліста ўтрымлівае абразьлівыя выразы на адрас кіраўніка дзяржавы. У судзе высьветлілася, што Кацярына Садоўская ліст пісала — і яна ад гэтага не адмаўлялася, але не пасьпела яго нікому даслаць, бо яе арыштавалі. Ліст знайшлі падчасператрусу ў кватэры.

Прадстаўніца пракуратуры папрасіла пакараць праваабаронцу трыма гадамі пазбаўленьня волі з адбыцьцём пакараньня ў калоніі агульнага рэжыму. На судзе прысутнічалі дзеці Садоўскай і муж.

23 кастрычніка ў судзе Ленінскага раёну сабралася некалькі дзясяткаў чалавек, якім у свой час дапамагала Кацярына Садоўская, паведаміла Радыё Свабода. Прыйшлі і прадстаўнікі амерыканскай амбасады, грамадзкасьць, што, тым ня менш, мала паўплывала на аб'ектыўнасьць вынесенага судовага рашэньня.

Абвінаваўца Наталя Талаш прасіла пакараць 60-гадовую жанчыну пазбаўленьнем волі на тры гады за абразу Аляксандра Лукашэнкі. Таксама Наталя Талаш абвінаваціла пенсіянерку ў тым, што тая пагражала судзьдзі Кіраўскага суда Надзеі Чмары.

Судзьдзя Ленінскага райсуда Менску Тацяна Жулкоўская пакарала Кацярыну Садоўскую пазбаўленьнем волі на два гады ў калоніі агульнага рэжыму. Паводле прысуду, яна мусіць таксама заплаціць 4 мільёны рублёў маральнай кампенсацыі судзьдзям Кіраўскага суда Чмары і Уліцінай і ўсе судовыя выдаткі.

Сваякі Кацярыны Садоўскай, муж-інвалід і дзеці не чакалі такога жорсткага прысуду. Праваабаронца ў красавіку перанесла анкалагічную аперацыю. У яе дома хворая 84-гадовая маці.

На судзе прысутнічаў Вячаслаў Сіўчык. Ён назваў суд над Кацярынай Садоўскай расправай: "На вялікі жаль, справу Садоўскай беларускае грамадзтва крыху праспала. Я сам пра гэта даведаўся досыць нядаўна. Для мяне вельмі важна, што гэтая жанчына спрабавала да канца адстойваць свае правы, правы тых людзей, якія да яе зьвярталіся па дапамогу. Прынятае рашэньне, але ж я ня думаў, што яно будзе такое цынічнае і нахабнае. Вядома, гэта расправа. Апошняй кропляй стала тое, што суд — і той мусіць праплаціць гэтая бедная жанчына. Гэта сапраўды зьдзек. Зьдзек з Садоўскай, зьдзек з беларускага народу".

Нагадаем, што Кацярыну Садоўскую затрымалі 25 ліпеня. Спачатку яе трымалі ў псіхіятрычным шпіталі, а потым перавялі ў сьледчы ізалятар у Менску на вуліцы Валадарскага. Суд не ўлічыў часу, калі праваабаронца была пад вартай у шпіталі — і адлік тэрміну адбыцьця пакараньня пайшоў ад моманту пераводу яе ў СІЗА.

# Правакацыя — іх метад...

***Беларускія ўлады распачалі новую крымінальную справу — супраць кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня інвалідаў вайны ў Аўганістане Аляксандра Камароўскага***

22 кастрычніка прадстаўнікі сілавых структураў апячаталі жодзінскі офіс грамадзкага аб'яднаньня інвалідаў вайны ў Аўганістане, а 23 кастрычніка правялі ў ім вобыск. Былі канфіскаваныя каля трохсот асобнікаў газеты "Народная воля", кампутары і 300 фальшывых даляраў. Вобыск адбываўся ў рамках крымінальнай справы, заведзенай на Аляксандра Камароўскага, старшыні грамадзкага аб'яднаньня інвалідаў вайны ў Аўганістане, пасьля таго, як уноч з 21 на 22 кастрычніка на беларуска-польскай мяжы ў яго былі знойдзеныя 500 фальшывых даляраў. Тады лідэр інвалідаўаўганцаў накіроўваўся ў Варшаву на сустрэчу з прадстаўнікамі партнёрскіх арганізацыяў. На брэсцкай мытні ў шапцы сп. Камароўскага нечакана аказаліся фальшывыя 500 даляраў. Берасьцейскія мытнікі і міліцыянты зьнялі яго з цягніка і ўчынілі шматгадзінны допыт...

Аляксандр Камароўскі — падпалкоўнік у адстаўцы, удзельнік вайны ў Аўганістане. Дваццаць гадоў таму заснаваў грамадзкае аб'яднаньне інвалідаўаўганцаў. Гэты інцыдэнт сп. Камароўскі называе правакацыяй, Карэспандэнту Радыё Свабода ён патлумачыў: "Два артыкулы выйшлі ў мяне ў "Народнай Волі". Вось з гэтым я і зьвязваю мой арышт і перасьлед. І плюс у аўганскім руху я прынцыповы незалежны кіраўнік".

У артыкулах спадара Камароўскага, што надрукавала газета "Народная Воля" і некаторыя інтэрнэт-выданьні, выказваецца публічная крытыка на адрас уладаў, крытыкуецца і Аляксандр Лукашэнка. У прыватнасьці, аўтар паведаміў, што зьбіраецца на базе аўганскага руху стварыць апазіцыйную палітычную партыю.

У Жодзіне Аляксандр Камароўскі адкрыта супрацоўнічае з мясцовымі апазіцыянерамі. Напрыклад, у жніўні з удзелам "аўганцаў" праходзіў летнік для дэмакратычнай моладзі, які разагналі міліцыянты. Сярод паплечнікаў спадара Камароўскага моладзевы актывіст Павал Красоўскі, які пракаментаваў сітуацыю наступным чынам: "Я таксама лічу, што гэта правакацыя з боку сьпецслужбаў. Зразумела, што ня мог такі паважаны чалавек везьці фальшывыя даляры. Ён заўсёды дапамагае моладзі нашага гораду, старым, дапамагае тым, хто шукае працу і ня можа ўладкавацца".

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч кажа: "Факт узбуджэньня крымінальнай справы супраць кіраўніка жодзінскага грамадзкага аб'яднаньня інвалідаў вайны ў Аўганістане, сябрам якой таксама зьяўляецца Павел Красоўскі, насьцярожвае досыць дзіўнай заканамернасьцю: як толькі сп. Камароўскі публічна выступіў у абарону Паўла, якога затрымалі і падазравалі ў далучанасьці да віцебскіх выбухаў і нават у забойствах і гвалтаваньнях, праз нейкі час у яго знаходзяць фальшывыя грошы... Падобная акалічнасьць мне здаецца вельмі невыпадковай, бо фальшывыя даляры ўжо не адзін раз фігуравалі ў палітычна матываваных крымінальных справах, варта ўзгадаць справу Міхаіла Марыніча, калі былога дыпламата падазравалі ў захоўваньні нібыта вялікай колькасьці фальшывых даляраў, што, аднак, не пацьвердзіла эксьпертыза. Такі метад, калі падкідваюць наркотыкі ці фальшывыя грошы, даволі часта выкарыстоўваецца ў некаторых краінах постсавецкай прасторы, таму крымінальная справа супраць Аляксандра Камароўскага, хутчэй за ўсё, палітычна матываваная".

## "Перакрываюць кісларод"

Перад мясцовымі выбарамі ўлады Клецку вырашылі "перакрыць кісларод" мясцоваму актывісту дэмсілаў Сяргею Панамарову. Актывіст дэмакратычных сілаў Сяргей Панамароў на працягу сямі месяцаў за ўласныя сродкі друкаваў бюлетэнь "Бойкі Клецк", дзе інфармаваў сваіх землякоў аб палітычных, эканамічных і сацыяльных навінах, якія застаюцца за межамі афіцыйных СМІ.

Як паведамляе прэс-служба Аб`яднанай грамадзянскай партыі, свой бюлетэнь ён назваў у гонар кіраўніка Клецкага выканкаму Анатоля Бойкі, які, па меркаваньні Сяргея Панамарова, лічыць сябе паўнапраўным і адзіным гаспадаром у горадзе. У выданьні Панамароў падымаў пытаньні нездавальняльнай працы службаў камунальнай гаспадаркі і мясцовых службоўцаў.

Сяргей Панамароў і ягоная жонка Сьвятлана, юрыст па адукацыі, прапанавалі жыхарам гораду прававую дапамогу: кансультацыі, напісаньне зыскавых заяваў. Напярэдадні мясцовых выбараў, на С. Панамарэнку пачалося псіхалагічнае ўзьдзеяньне і пагрозы ўзбудзіць крымінальную справу за некаторыя публікацыі ў газеце. Ягонай жонцы некалькі разоў тэлефанавалі невядомыя і раілі на час – да 14 студзеня, калі адбудуцца мясцовыя выбары, зьехаць з гораду.

# У мэтах барацьбы з тэрарызмам

***Міністэрства юстыцыі Беларусі запланавала дапаўненьні ў Закон аб друку***

Міністэрства юстыцыі Беларусі прапануе, у адпаведнасьці з падрыхтаваным ім законапраектам "Аб унясеньні дапаўненьняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаньнях супрацьдзеяньня тэрарызму", дапоўніць артыкул 5 Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі" палажэньнем аб недапушчэньні выкарыстаньня СМІ для "распаўсюджваньня інфармацыі, якая служыць прапагандзе альбо апраўданьню тэрарызму".

— Сёньня мы гэты праект закону перадалі на разгляд у Савет Міністраў. Папярэдне дакумент быў узгоднены з усімі зацікаўленымі бакамі: КДБ, МУС, Мініфармацыі, Пракуратурай і Вярхоўным судом, — паведамілі прэс-службе БАЖ у Міністэрстве юстыцыі.

Зараз Законам "Аб барацьбе з тэрарызмам" устаноўленая забарона на распаўсюджаньне такой інфармацыі. Аднак гэтая норма дзейнічае толькі падчас правядзеньня контртэрарыстычнай аперацыі, — сьцьвярджаецца ў пісьмовым адказе Міністэрства юстыцыі за подпісам намесьніка міністра І.Тушынскага на афіцыйны запыт БАЖу. "Разам з тым, сёньня практычна ўсе арганізацыі радыкальнага кшталту маюць свае сайты ў Інтэрнэце. Міжнародныя тэрарысты актыўна выкарыстоўваюць існуючыя інфармацыйныя рэсурсы сеткі Інтэрнэт для прапаганды сваіх ідэяў, разьмяшчэньня матэрыялаў, якія апраўдваюць тэрарызм, і г.д. Акрамя таго, у шэрагу выпадкаў на інтэрнэт-сайтах сродкаў масавай інфармацыі пры асьвятленьні ходу судовых працэсаў па справах аб тэрарызме адбываецца абнародаваньне выступленьняў у абарону абвінавачаных-тэрарыстаў,"— тлумачыцца ў лісьце неабходнасьць унясеньня дапаўненьняў у Закон аб друку.

Свой пункт гледжаньня на запланаваныя дапаўненьні выказаў Андрэй Бастунец, намесьнік старшыні грамадзкага аб'яднаньня "Беларуская асацыяцыя журналістаў":

— Гэты законапраект адлюстроўвае агульную тэндэнцыю: абмежаваньне свабоды выказваньняў. Я ня бачу неабходнасьці ў Беларусі, якая, дзякую Богу, не знаходзіцца на першай лініі фронту барацьбы з тэрарызмам, уводзіць у закон аб друку гэткія нормы. Рызыка не ў дапаўненьні закону, а ў тым, як ён будзе выкарыстоўвацца на практыцы. Тое, што гэткая рызыка існуе, падкрэсьлівае нават абгрунтаваньне Мінюсту: маўляў, пры асьвятленьні ходу судовых працэсаў СМІ могуць абнародаваць выступы ў абарону абвінавачаных-тэрарыстаў. Але, па-першае, калі гэтыя выступы адбыліся падчас адкрытых справаў, то аб абнародаваньні казаць ужо нельга (гэта адбылося падчас судовага разьбіральніцтва). Па-другое, няблага памятаць, што абвінавачаныя карыстаюцца прэзумпцыяй невінаватасьці, і выступы ў іх абарону яшчэ ня ёсьць выступамі ў абарону тэрарызму.

## "Недзяржаўная прэса церпіць ад астракізму з боку дзяржавы"

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ Вольга Абрамава прапанавала ўраду разгледзець сітуацыю з недзяржаўнымі СМІ. Зьвяртаючыся 27 кастрычніка ў парламенце да віцэ-прэм'ера ўраду Барыса Батуры, яна зазначыла, што "недзяржаўная прэса церпіць ад астракізму з боку дзяржавы". У якасьці прыкладу дэпутат выклала сітуацыю з выданьнямі «Народная воля», «Товарищ», «БДГ.Деловая газета», «Витебский курьер» і «Борисовские новости», якія не былі ўключаныя ў падпісныя каталогі і ня могуць распаўсюджвацца праз сістэму "Белсаюздруку". В.Абрамаву не задавальняюць адказы са спасылкай на стасункі гаспадарчых суб'ектаў, бо ў гэтым выпадку можна весьці гаворку пра мэтанакіраваную дзяржаўную палітыку.

Таксама дэпутат прапанавала заканадаўча абмежаваць памеры штрафаў і тэрміны выстаўленьня зыскаў па справах абароны дзелавой рэпутацыі, якія выстаўляюцца да журналістаў і выданьняў.

## Газету Слонімскую" ўлады забараняюць прадаваць

Днямі рэдакцыя "Газеты Слонімскай" страціла чарговую гандлёвую кропку, дзе рэалізоўвала сваё выданьне. Ад-нага з індывідуальных прадпрымальнікаў г.Слоніму (Гродзенская вобл.), які ў прыватнай краме доўгі час прадаваў незалежнае грамадзка-палітычнае выданьне, выклікалі ва ўпраўленьне адукацыі Слонімскага райвыканкаму, дзе паставілі ультыматум: ён павінен неадкладна спыніць продаж незалежнай газеты. У адваротным выпадку яму скасуюць дамову на арэнду памяшканьня, дзе месьціцца крама. Справа ў тым, што будынак, дзе прадпрымальнік арганізаваў свой бізнэс, належыць упраўленьню адукацыі.

Чалавека паставілі перад фактам, і яму нічога не заставалася, як прыняць умовы чыноўнікаў, паведаміла прэс-служба БАЖ.

## Факту парушэньня правоў журналістаў... ня выяўлена

ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" атрымала ліст з УУС Магілёўскага аблвыканкаму, у якім ідзе гаворка пра расьсьледаваньне факту затрыманьня журналістаў 31 жніўня ў г.Бабруйску. У лісьце паведамляецца, што УУБ УУС Магілёўскага аблвыканкаму на падставе звароту, які паступіў з пракуратуры Ленінскага раёну г.Бабруйску, правяло праверку, у выніку якой ня выяўлена факту незаконнага затрыманьня журналістаў, што выконвалі свае прафесійныя абавязкі 31.08.2006 году. У выпадку нязгоды з прынятым рашэньнем, яго можна абскардзіць ва ўстаноўленым парадку.

Нагадаем, што ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" зьвярталася да абласнога і раённага кіраўніцтва органаў унутраных справаў з патрабаваньнем прыцягнуць да адказнасьці супрацоўнікаў міліцыі, якія парушылі правы журналістаў і беларускае заканадаўства аб СМІ падчас акцыі пратэсту А. Чыгіра 31 жніўня 2006 году.




*Незалежную газету "Народная Воля" пасьля забароны распаўсюду з дапамогай дзяржаўнага манапаліста "Белсаюздруку" набыць у Менску стала немагчыма, а потым пасьля забароны на падпіску праз яшчэ аднаго манапаліста "Белпошту" немагчыма стала выпісаць... Цяпер газету распаўсюджваюць прыватныя асобы, простыя грамадзяне, кожную хвіліну рызыкуючы сваёй будучыняй...*

## Беларусь у "лідэрах" па несвабодзе прэсы

Міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры бяз межаў» прадставіла новы рапарт, датычны свабоды прэсы ў сьвеце.

Паводле гэтага дакументу, Беларусь надалей знаходзіцца сярод краінаў, дзе здараюцца найбольш выразныя парушэньні правоў журналістаў. Сёлетні сьпіс бярэ пад увагу 168 краінаў, а Беларусь знаходзіцца на 151 месцы, побач з такімі краінамі, як Йемен, Лівія, Сірыя, Ірак, Вьетнам, Лаос, Пакістан, Узьбекістан.

Арганізацыя «Рэпарцёры бяз межаў» заўважае, што, на жаль, сітуацыя са свабодай прэсы ў згаданых дзяржавах не мяняецца цягам некалькіх гадоў.

Найгоршая сітуацыя аднатаваная ў Паўночнай Карэі, Туркменістане, Эрытрэі. У сваю чаргу найлепшая — у Фінляндыі, Ісландыі, Ірландыі, Галандыі.

Цікава, што краіны, дзе ў часы камунізму існавала цэнзура, сёньня знаходзяцца ў першай дзясятцы. І ў гэтым аўтары дакументу бачаць пазітыўную тэндэнцыю.

Паводле сайту "Нашай Нівы", рапарт пра стан свабоды прэсы створаны на падставе адказаў на 50 пытаньняў, якія прадстаўнікі арганізацыі «Рэпарцёры бяз межаў» задалі арганізацыям, журналістам, юрыстам і праваабаронцам. Пытаньні датычылі свабоды прэсы ў іх краінах.

У СНД горш, як у Беларусі, сродкі масавай інфармацыі пачуваюцца толькі ва Узьбекістане (155-е месца). З нашых суседзяў Латвія заняла 10-е месца, Літва — 27-е, Польшча — 58-е. Украіна падзяліла з Індыяй 105-ю пазіцыю, а Расія апынулася на 147-м месцы.

# Аляксандр Казулін: барацьба працягваецца

20 кастрычніка былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Аляксандр Казулін пачаў у турме галадоўку пратэсту супраць незаконнага, як ён лічыць, знаходжаньня пры ўладзе Аляксандра Лукашэнкі

Мэты галадоўкі Аляксандр Казулін сфармуляваў месяц таму ў адмысловым лісьце, перададзеным на волю. Палітык заявіў, што ня лічыць сакавіцкія выбары адбыўшыміся, а таму Аляксандр Лукашэнка, на ягоную думку, мусіць перадаць абавязкі прэзідэнта прэм'еру Сяргею Сідорскаму, ад якога Аляксандр Казулін цягам месяцу чакае прызначэньня новых выбараў.

Два дні таму, сустракаючыся са сваякамі ў калоніі, былы кандыдат на пасаду прэзідэнта пацьвердзіў намер пачаць бестэрміновую галадоўку менавіта 20 кастрычніка. Ён сказаў, што паінфармаваў пра гэта і адміністрацыю калоніі.

У адміністрацыі пацьвердзілі, што ведаюць пра намер Аляксандра Казуліна галадаваць, але адмовіліся даць зьвесткі пра ўмовы, у якіх будзе праходзіць галадоўка. Раней у адміністрацыі калоніі заяўлялі, што на час галадоўкі перавядуць Аляксандра Казуліна ў асобнае памяшканьне. Хутчэй за ўсё, у медычную частку.

Як паводле закону адміністрацыя папраўчай установы павінна рэагаваць на галадоўку зьняволенага? Адвакат палітыка Ігар Рынкевіч патлумачыў для Радыё Свабода:

— Лічыцца, што гэта не парушэньне турэмнага рэжыму, калі чалавек адмаўляецца ад ежы і выстаўляе пэўныя патрабаваньні. Цягам трох дзён адміністрацыя калоніі мусіць паведаміць вышэйшаму кіраўніцтву і паінфармаваць пракуратуру, а менавіта таго пракурора, які назірае за законам у калоніі. Пракурор-назіральнік павінен прыехаць, выслухаць патрабаваньні і адрэагаваць на іх: выканаць, калі гэта паводле закону і ў яго кампетэнцыі, а калі не, тады дакласьці далей па інстанцыі.

Ігар Рынкевіч спадзяецца, што ягонага падабароннага перавядуць у медычную частку, дзе за станам здароўя будзе весьціся нагляд. Адвакат ня выключыў, што галадоўку Казуліна могуць прымусова спыніць.

— Могуць прымусова яго скруціць і ўвесьці яму ў кроў раствор глюкозы. Калі я быў у калоніі 10 кастрычніка, мне пра гэта намякнулі. Маўляў, каб выратаваць жыцьцё. Тым больш, што Казулін заявіў, што будзе галадаць да апошняга: і 30, і 40 дзён.

Жонка палітыка Ірына Казуліна кажа, што падтрымлівае мужавы палітычныя погляды, але яна — супраць галадоўкі. "Здароўе адно", — кажа яна. На апошнім спатканьні з мужам сп. Ірына спрабавала адгаварыць яго ад галадоўкі, але гэта не ўдалося. Затое падчас апошняй сустрэчы Аляксандр Казулін больш пэўна акрэсьліў умову, пры якой ён спыніць галадоўку.

— Я бачу, што ён найперш арыентаваны на міжнародны ўзровень. Ён сказаў, што спыніць галадоўку, калі пытаньне па Беларусі будзе разгледжанае ў ААН.

Вядома, што 19 кастрычніка Ірына Казуліна сустракалася з шэрагам кіраўнікоў беларускай апазіцыі, з якімі абмеркавала захады палітычнай падтрымкі акцыі яе мужа.

Нагадаем, што Аляксандр Казулін быў асуджаны на пяць з паловаю гадоў зьняволеньня — суд палічыў яго вінаватым у хуліганстве і арганізацыі вулічных беспарадкаў 25 сакавіка. Экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта вінаватым сябе не прызнае і тлумачыць перасьлед палітычнымі матывамі.

22 кастрычніка адміністрацыя папраўчай калоніі "Віцьба-3" пацьвердзіла інфармацыю, што ў калоніі галадаюць двое зьняволеных – экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін і былы дэпутат, лідэр групы "Рэспубліка" С.Скрабец.

Былы дэпутат Сяргей Скрабец, асуджаны 14 лютага 2006 году па абвінавачаньні ў выманьваньні крэдыту ў дзяржавы на два з паловай гады, абвясьціў галадоўку з-за таго, што яго дагэтуль не прадставілі да ўмоўна-датэрміновага вызваленьня. "Скрабец таксама галадае на знак салідарнасьці з Аляксандрам Казуліным", – паведаміў прэс-цэнтру Хартыі`97 кіраўнік юрыдычнай службы А.Казуліна Алег Воўчак.

Былы дэпутат, лідэр групы "Рэспубліка", палітвязень Сяргей Скрабец амніставаны і выйдзе на волю праз некалькі тыдняў. Гэта пацьвердзіў Руслан Прымак, намесьнік начальніка калоніі "Віцьба-3", у якой адбывае пакараньне Сяргей Скрабец. Міліцыянт паведаміў, што днямі суд, паводле амністыі, зьняў з Сяргея Скрабца год з ягонага пакараньня. Паводле Руслана Прымака, "на волю былы дэпутат можа выйсьці ўжо 11 лістапада".

Аляксандр Казулін, шпіталізаваны ў медсанчастку, паведаміў журналістам у Менску генеральны пракурор Беларусі Пётр Міклашэвіч.

Міклашэвіч таксама паведаміў, што "у медсанчастцы Казулін увесь час знаходзіцца пад медычным наглядам".

Генпракурор праінфармаваў, што пракуратура Віцебскай вобласьці правяла праверку ў сувязі з галадоўкай Казуліна ў папраўчай калоніі №3 у Віцебску і высьветліла, што 20 кастрычніка, калі асуджаны пачаў галадоўку, скаргаў на яго не паступала, ён захоўваў распарадак дня, парушэньняў рэжыму не допускаў. Па словах генпракурора, медыкі вялі штодзённы кантроль за станам здароўя з першага дня галадоўкі Казуліна.

Раней, нагадаем, да Казуліна не дапусьцілі адваката. Адміністрацыя калоніі паведамляе сваякам палітвязьня, што ён выглядае выключна "бадзёрым і вясёлым". Праваабаронцы не выключаюць, што ўлады могуць утойваць сапраўдны стан здароўя Аляксандра Казуліна.

20 кастрычніка ў Наваполацку сябра Кансерватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Анатоль Кулік спыніў галадоўку, пачатую 4 кастрычніка. Гэта была акцыя палітычнай падтрымкі Аляксандра Казуліна. Паводле словаў Анатоля Куліка, у часе галадоўкі ён не пакідаў працы ў адной з прыватных кампаніяў.

Гэта другая сёлета палітычная галадоўка Анатоля Куліка. Першую ён праводзіў супраць інаўгурацыі прэзідэнта Лукашэнкі. Цяперашнюю акцыю таксама называе палітычнай і яе прычыны тлумачыць так:

— Сам Казулін павінен адчуваць і ведаць, што падтрымка ёсьць і будзе. Асабліва за яго ўчынкі і дзейнасьць. Вось гэта мне імпануе. Пастарункі і краты ня зломяць мужных людзей.

Са словаў Анатоля Куліка, ён зьяўляецца сябрам БНФ ад 1988 году, быў удзельнікам першага зьезду руху, узначальваў гарадзкую арганізацыю Кансерватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ, быў абраны дэпутатам Наваполацкага гарсавету. Суразмоўца кажа, што калі даведаўся пра зварот палітвязьня Аляксандра Казуліна да грамадзянаў Беларусі і пра яго намеры пачаць у кастрычніку бестэрміновую галадоўку, дык адразу вырашыў падаць знак салідарнасьці:

— Калі моцныя суполкі, палітычныя партыі, то яны мусяць больш буйныя акцыі рабіць. А адзін чалавек што можа? Вось галадаваць. Гэта так, гэта яго справа. А разам трэба рабіць больш буйныя акцыі. Каб улада адчувала, што ёсьць палітычная сіла, а не адзінкі.

Анатолю Куліку – за 60 гадоў. Нельга абысьці пытаньне пра здароўе, нават калі голас чалавека падаецца бадзёрым.

— Вытрымаў, дзякуй Богу. Як кажуць, трэба ня толькі мужнае сэрца мець, але яшчэ і моцнае



На адной з акцыяў "Свабоду Казуліну!".

# Галадоўка спыненая, акцыя працягваецца

28 кастрычніка вернікі суполкі “Новае жыццё” атрымалі адказ з Вышэйшага гаспадарчага суда аб тым, што наглядная камісія апратэставала рашэньне Менскага гаспадарчага суда. Згодна з ягоным прысудам на рахунак царквы пералічылі 35 мільёнаў рублёў кампенсацыі за храм вернікаў, а сам будынак перавялі ў гарадзкую маёмасьць. Паколькі рашэньне ўступіла ў законную сілу, вернікі вырашылі часова спыніць галадоўку, але яны будуць кругласутачна знаходзіцца ў сваім будынку. Яны запэўнілі, што галадоўка спыненая часова, але акцыя пратэсту будзе працягвацца, пакуль ня будзе вырашаная праблема.

У суботу ў будынку царквы “Новае жыццё” сабраліся прадстаўнікі грамадзкіх арганізацыяў, дзеячы мастацтва і прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі па прапанове ініцыятыўнай групы стварыць “Грамадзянскую Раду” дзеля ўратаваньня вернікаўхрысьціянаў. Пастар царквы Вячаслаў Ганчарэнка выказаў усім падзяку за падтрымку і, падсумоўваючы вынікі галадоўкі, адзначыў, што ўлады ігнаравалі акцыю, не забясьпечылі сталага медычнага кантролю за галадоўнікамі, утойвалі інфармацыю пра галадоўку хрысьціянаў. Вячаслаў Ганчарэнка назваў зьвесткі пра царкву, якія распаўсюдзіў тэлеканал СТВ, паклёпніцкімі.

Нягледзячы на пратэст наглядная камісіі Вышэйшага гаспадарчага суда, паводле закону, рашэньне Менгарвыканкаму пакуль прававажнае. Дату перагляду справы мусяць прызначыць на працягу месяцу. За гэты час вернікаў у любы момант могуць прымусова выселіць з будынку. Таму акцыя пратэстантаў працягваецца: штодня ў будынку будуць кругласутачна знаходзіцца людзі, дзяжурства ахоўнікаў не адмененае.

Старшыня суполкі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) акцыянернага таварыства “Белшына” Рыгор Спасюк паведаміў Радыё Свабода, што сябры БНП вырашылі перапыніць галадоўку. Акцыю пратэсту працягне толькі Алена Захожая. “Сёньня ўжо 28 дзень, як Алена адмаўляецца ад ежы”, — удакладніў Рыгор Спасюк.

У мінулую пятніцу Рада Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў прыняла Зварот да ўдзельнікаў галадоўкі на “Белшыне”. Рыгор Спасюк кажа, што прапанова прынятая, бо цяперашні стан здароўя ўдзельнікаў галадоўкі не дазваляе выконваць цяжкую фізічную працу на прадпрыемстве.

Алена Захожая ня першы раз трымае галадоўку. Яшчэ ў траўні 2001 году акцыя пратэсту доўжылася 15 сутак, пасьля чаго адміністрацыя “Белшыны” мусіла дазволіць суполцы БНП арэндаваць памяшканьне. Пасьля Бабруйскі гарвыканкам зарэгістраваў юрыдычны адрас арганізацыі.

## Перасьлед настаўнікаў

20 кастрычніка судзьдзя Бабруйскага гарадзкога суда Валянціна Голуб адхіліла патрабаваньні дэпутата мясцовага гарсавету Алеся Чыгіра, які хацеў аднавіцца на працы. Былы настаўнік гісторыі сярэдняй школы №8 гораду Бабруйску зьбіраецца падаваць касацыйную скаргу ў Магілёўскі абласны суд.

“Я не чакаў іншага рашэньня. Паседжаньне было кароткае. Хутчэй за ўсё, матэрыялы былі падрыхтаваныя загадзя. Казалі, што ў мяне быў прагул 25 сакавіка. Але гэта была субота. Да гэтага ў суботу ніколі не было ўрокаў. Тады ж нібыта быў загад дырэктара школы, каб усе настаўнікі знаходзіліся ў школе. А я ў гэты дзень паехаў у Менск на плошчу,”— распавёў Алесь Чыгір.

Прыкладам таго, што ў Беларусі цяпер існуе перасьлед настаўнікаў за палітычныя перакананьні, зьяўляюцца таксама звальненьні дэпутатаў мясцовых саветаў Леаніда Гаравога ў Гарадку і Яўгена Пракурата ў Белаазёрску, лічыць Алесь Чыгір.

Пазбаўлены працы настаўнік мае трох непаўналетніх дзяцей. Каб утрымліваць сям’ю, Алесь уладкаваўся на працу ў незалежную газету «Бабруйскі кур’ер».

# Гісторыя трох дзён

(Пачатак на стар. 3)

пераўтвараецца ў таго ж ізгоя, над якім, праўда, менш сьмяюцца, але больш ненавідзяць.

Апынуўшыся ў іншай заканадаўчай сістэме, я не задумваўся над сваім месцам у ёй. Ва ўплывовых шэрагі не імкнуўся і ведаў таксама, што насесьці на мяне асабліва не атрымаецца. Карацей, імкнуўся, стаяць адасоблена ад мясцовых законаў, але адразу апынуўся ў супрацьстаяньні з імі.

### Супрацьстаяньне

Пытаньні ўзьніклі адразу ж у адстойніку. Быў там адзін дзядок, які, зайшоўшы ў камеру, меў неасьцярожнасьць, з-за адсутнасьці месца, сесьці на падлогу. Тут і пачалі яго цкаваць – ты, маўляў, дзядок – апушчаны, сядзі каля дальняка, да іншых не дакранайся, еш асобна і г.д. Безумоўна, на такое глядзець цяжка, таму бяз ніякіх ваганьняў, я пачаў абараняць дзядулю. Напачатку мяне не зразумелі, потым разлаваліся, а затым на мяне пачалі накідвацца. Чаго я толькі не наслухаўся за тыя тры дні, ад абаронцаў злодзейскай маралі – і што я прыдурак, і што сектант, і што мяне, калі я не супакоюся, разам з гэтым дзедам у гарэм запішуць, ну і шмат іншых цікавых рэчаў.

І што самае дзіўнае, дык тое, што сядзяць гэтыя новаяўленыя барацьбіты з бесчалавечнаю мусарскай сістэмай і разважаюць: “Ну і падонкі мусары (міліцыянт перацягнуў аднаго з іх, калі нас вадзілі браць кроў) – над людзьмі зьдзекуюцца, б’юць іх, прыніжаюць мінімальную чалавечую годнасьць”. І тут жа самі, праз некалькі хвілінаў, пачынаюць зьдзекавацца з дзеда, які вырашыў паднядца з падлогі і пахадзіць па камеры. “Хлопцы, — кажу я ім, — вы папракаеце міліцыянтаў у бесчалавечнасьці, а самі чым адрозьніваецеся ад іх? Адкуль у чалавека, які сам штодзённа церпіць зьнявагу, хапае сілаў зьняважаць іншых?“ Арыштанты патроху аціхлі і дзеда больш не кранали.

### Жыццёвая выснова

Канфлікт быў вычарпаны. Але я дагэтуль думаю – Госпадзі, дык як жа так уладкавана чалавечае сэрца, якое, трапляючы пад узьдзеяньне зла, не знаходзіць сілаў і жаданьня яго спыніць, а памнажаючы шматкроць, нясе гэтае зло іншым?




І ня трэба думаць, што гэтая праблема таго месца, у якім я знаходжуся. Проста ў экстрэмальных умовах чалавечыя якасьці і заганы маюць схільнасьць абвастрацца. Таму і сітуацыя такая, у тым ці іншым фармаце, ёсьць паўсюль вакол нас. І калі мы агледзімся, дык убачым, наколькі часта самі трапляем у гэты ланцуг, па якім зло рухаецца ад аднаго чалавека да другога.

Апостал Павал ведаў гэтую схільнасьць чалавечых сэрцаў і папярэджваў нас: “Ня дайся, каб цябе перамагло зло, але перамагай зло дабром”. (Рым 12:21). Гэтыя словы могуць здацца простымі, бо як часта мы чулі гэта ў сям’і, школе, чыталі ў філасофскіх кнігах. Але як цяжка бывае самому, у штодзённай практыцы, адказаць камусьці на зло дабром. А знайсьці ў сабе сілы зрабіць так можна толькі тады, калі крыніца Божай дабрыні і любові будзе жыць у нашым сэрцы: “Дарагія, будзем любіць адзін аднаго, бо любоў ад Бога і кожны, хто любіць, нарадзіўся ад Бога і ведае Бога. А хто ня любіць, ня ведае Бога, бо Бог ёсьць любоў” (1 Яна 4:7-8)

І калі нехта з нас жадае спасьцігнуць Госпада, словы гэтыя мусяць быць нашым арыенцірам у барацьбе са злом, як злодзейскай ці міліцэйскай сістэмы, так і любой іншай. Бо толькі любоў можа перамагчы прасавецкую ідэалогію і атэізм, дэспатыю і беззаконьне. Толькі любоў да бліжняга можа спыніць гэтае зло, што паўстала на нашай змучанай зямлі.

# За мяжу — толькі з дазволу міністэрства

## *У студэнтаў журфаку БДУ ўзялі падпіскі аб нявыезьдзе...*

У самым пачатку кастрычніка Беларускай школаю журналістыкі супольна з польскім цэнтрам міжнародных стасункаў быў зладжаны трэнінг для беларускіх журналістаў у Варшаве. Сярод іх былі і студэнты факультэту журналістыкі БДУ. Калі група журналістаў пасьля трэнінгу вярталася ў Менск цягніком, падчас праверкі пашпартоў супрацоўніца камітэту дзяржаўнай бясьпекі перапісала імёны і прозьвішчы ўсіх, хто браў удзел у праграме. Сярод іх была студэнтка другога курсу факультэту журналістыкі БДУ, сябра моладзі Партыі БНФ Даша Румянцава.

У аўторак, 24 кастрычніка, Дашу выклікалі ў дэканат для размовы з намесьнікам дэкана па ідэалогіі Ганнай Віктараўнай Курэйчык. Пасьля гутаркі ад Дашы запатрабавалі напісаць тлумачальную на імя дэкана, хаця перад гэтым яна вусна патлумачыла, дзе знаходзілася ў перыяд з 2 па 6 кастрычніка. Даша напісала, што адсутнічала на занятках па прычыне знаходжаньня ў Варшаве на трэнінгу для журналістаў. Такое тлумачэньне не задаволіла спадарыню Курэйчык, і яна паклікала дэкана Сяргея Валянцінавіча Дубовіка для працягу размовы з Дашаю. Пасьля пагрозаў наконт адлічэньня за пропускі і абвінавачваньняў у наўмысным парушэньні статуту БДУ дэкан запатрабаваў перапісаць тлумачальную цыдулку. Пад яго дыктоўку Даша мусіла напісаць, што наўмысна прагуляла заняткі, чым парушыла ўнутраны распарадак факультэту. Вуснага абяцаньня з боку студэнткі, што такое больш не паўторыцца было недастаткова: яе папрасілі напісаць расьпіску аб тым, што яна не пакіне межы Беларусі без дазволу дэкана факультэту журналістыкі і без адмысловага дазволу міністэрства адукацыі. Варта адзначыць, што міністэрства адукацыі дае дазвол на ўдзел у адукацыйных праграмах толькі ў тых арганізацыях, з якімі БДУ мае афіцыйныя дамовы. Да таго ж, зьвяртацца па дазвол патрэбна не пазьней, чым за 30 дзён да паездкі.

Паводле інфармацыі прэс-службы партыі БНФ, у трэнінгу, на які езьдзіла Даша Румянцава, бралі ўдзел каля дзесяці студэнтаў факультэту журналістыкі. Усе яны былі прымушаныя напісаць аналагічныя расьпіскі. Ці мае права дэкан факультэту браць падобныя расьпіскі? Сітуацыю каментуе кіраўнік юрыдычнай камісіі Партыі БНФ Уладзімір Лабковіч:

— Гэта грубае парушэньне права чалавека на свабоднае перамяшчэньне. Разам з тым, вядома, дэкан ня мае права браць аніякіх расьпісак у студэнтаў. Яны не зьяўляюцца дакументамі і ніякай юрыдычнай сілы ня маюць. Тут навідавоку звычайнае запалохваньне студэнтаў, у тым ліку і з пагрозамі аб адлічэньні. Гэта ўсё сьведчыць пра тое, што ўлада баіцца і робіць усё для таго, каб ня даць магчымасьці людзям удзельнічаць у адукацыйных праграмах, якія, на жаль, сёньня практычна нельга праводзіць у межах Беларусі.

Што думае сама Даша Румянцава наконт сітуацыі, у якую яна трапіла? Студэнтка кажа:

— Мяне прымусілі напісаць тое, што пісаць я не хацела. Гэта быў гвалт. Мне пагражалі адлічэньнем, хоць я плачу за вучобу. Да таго ж, паводле статуту БДУ, адлічаць могуць толькі тых студэнтаў, якія прапусьцілі больш за 25 адсоткаў ад усіх заняткаў на працягу семестру. Я лічу, што мае правы былі парушаныя грубым чынам. Ні дэкан, ні яго намесьніца не хацелі слухаць нічога пра тое, што я ўдзельнічала ў трэнінгу, які цалкам адпавядае маёй сьпецыяльнасьці, што было вельмі крыўдна...

# Хочаш вучыцца — звальняйся

## *У Магілёве вымусілі пакінуць працу інжынера Ігара Барысава*

26 кастрычніка звольнены з працы сябра Магілёўскага абласнога камітэту Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады), адзін з лідэраў дэмакратычнай моладзі Магілёву Ігар Барысаў.

Пасьля сканчэньня інстытуту Ігар 2 гады і 3 месяцы працаваў інжынерам па якасьці на РУП завод "Магілёўліфтмаш".

Юрыдычнай падставай дзеля звальненьня стала спыненьне працоўнага кантракту па дамоўленасьці бакоў, фактычна ж адзін з бакоў – інжынер Барысаў – адчуваў пастаянны ціск з боку кіраўніцтва заводу і выслухоўваў пагрозы аб магчымым звальненьні па артыкуле, калі ён не пажадае спыніць дзеяньне кантракту.

Асабліва шчыраваў і "выхоўваў" інжынера Барысава намесьнік дырэктара па ідэалогіі нехта Л. М. Лебядзеўскі. Грамадзянін Лебядзеўскі ведаў, што забараніць займацца палітычнай дзейнасьцю сябру легальнай партыі ён ня мае права. Ён заявіў, што не забараняе інжынеру Барысаву займацца тым, чым ён займаецца ў вольны ад працы час, толькі дзеля гэтага трэба перастаць працаваць на "Магілёўліфтмашы". Выявілася, што дзейнасьць маладога сацыял-дэмакрата негатыўна адбіваецца на іміджы і маркетынгу прадпрыемства.

Мала таго, што сацыял-дэмакрат Барысаў падрывае дзелавую рэпутацыю "Магілёўліфтмашу" і прыносіць прадпрыемству фінансавыя страты, ён – інжынер – быў залічаны на магістарскую праграму "Дэмакратыя і грамадзянская супольнасьць" у Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, які вымушаны зараз дзейнічаць у Вільні. Начальства наадрэз адмовілася задаволіць заяву І. Барысава аб вызваленьні яго ад працы на час установачнай сесіі. Галоўны метролаг С. Лагун, пад чыім чулым кіраўніцтвам працаваў Ігар Барысаў, безапеляцыйна заявіў, што Вільня – фашысцкі горад, а ЕГУ – анархічная ўстанова. "А ты, – сказаў ён свайму падначаленаму, – нефармал. Адмаўляйся ад сваёй вучобы, бо я цябе туды не адпушчу і ніякія заявы падпісваць ня буду. Калі хочаш ехаць – кладзі заяву аб звальненьні на стол!"

У суботу 14 кастрычніка ў Магілёве адбыўся мітынг у падтрымку былога кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Казуліна, і Ігар Барысаў браў у ім актыўны ўдзел. Ён праводзіў акцыю "Напішы ліст падтрымкі А.Казуліну": раздаваў усім жадаючым канверты з адрасам турмы, у якой знаходзіцца палітвязень.

Пра гэта было дакладзена генеральнаму дырэктару "Магілёўліфтмашу". Апрача таго, гендырэктару паведамілі, што І.Барысаў арганізаваў два флэшмобы каля будынку абласнога КДБ. І што ён нібыта ўзначальваў калону юнакоў.

З КДБ у Ігара даўняе знаёмства. Камітэтчыкі ня раз наведвалі яго і прапаноўвалі сяброўства. Атрымаўшы адмову, яны вырашылі адыграцца і прыдумалі калону на чале з Барысавым. Тым часам на відэазапісе відаць, што малады актывіст не пакідаў 14 кастрычніка пляцоўкі, якую ўлады выдзелілі для мітынгу.

Пасьля дакладу ў гендырэктара інжынеру Барысаву быў прад'ўлены ультыматум: адмовіцца ад вучобы ў ЕГУ; напісаць заяву аб звальненьні з адкрытай датай (гэта значыць: як толькі ён пойдзе на партыйны сход ці сустрэчу моладзі, яго аўтаматычна звольняць з працы); папрасіць прабачэньня за свае неабдуманыя дзеяньні.

Была і чацьвёртая ўмова: мірна і спакойна на працягу месяцу звольніцца з прадпрыемства без усяляких адпрацовак і з чыстай працоўнай кніжкай.

"Я стаміўся баяцца," – кажа Ігар. – "Я стаміўся маўчаць, таму ніколі не хаваў сваіх думак і рабіў тое, што лічыў неабходным. Адно магу сказаць: чаго не хапае нашым кіраўнікам, дык гэта чалавечнасьці. Ніхто не заступіўся за мяне, ніхто не падтрымаў. Усе баяцца сваіх начальнікаў і калегаў, зубамі трымаюцца за свае крэслы. Час усё расставіць па сваіх месцах. Думаю, што маім начальнікам будзе ў недалёкай будучыні вельмі няёмка".

### Выключылі з тэхнікуму

**На паседжаньні камісіі Сьветлагорскага дзяржаўнага індустрыяльнага тэхнікуму было прынятае рашэньне аб адлічэньні з вучобы актывіста сьветлагорскага Маладога Фронту – Сержука Гумінскага. Афіцыйнай падставай да выключэньня былі названыя парушэньні ўнутраных правілаў тэхнікуму і шматлікія пропускі заняткаў. Кіраўнік практыкі, якую зараз праходзіць Сяржук, прапанаваў правесьці з навучэнцам адпрацоўкі. Але камісія палічыла гэта "немэтазгодным".**

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах. Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.

*Адрас рэдакцыі: 220012 Менск, а/с 9.*